НАДЗЕЯ БЕЛАЙ РУСІ

# Студэнцкая карона

*Абласны этап V рэспубліканскага конкурсу "Студэнт года" прайшоў 1 снежня на базе Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта і прынёс пераможны тытул прадстаўніцы ПалесДУ*



Фота Вячаслава ІЛЬЯНКОВА.

"Студэнт года" – гэта зусім не конкурс прыгажосці. Ён скіраваны на падтрымку студэнцкіх ініцыятыў і праектаў, стварэнне ўмоў для самарэалізацыі студэнцкай моладзі ў розных галінах дзейнасці. Менавіта таму падчас конкурсу можна пабачыць самых ініцыятыўных, паспяховых у вучобе і грамадскай дзейнасці, таленавітых у розных відах мастацтваў юнакоў і дзяўчат. А ладзіць конкурс Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Сёлетні абласны этап атрымаўся дзявочым. А месца правядзення – БарДУ – было не выпадковым. Нагадаем, што студэнтка менавіта гэтай ВНУ Аляксандра Малаканава летась перамагла ў рэспубліканскім фінале і стала "Студэнтам года" Беларусі. І сёлетнія канкурсанткі былі поўныя рашучасці здзіўляць, уражваць, радаваць. Яны паказалі і арганізатарскія здольнасці, і аратарскія, і інтэлектуальныя.

Запаветную "пуцёўку" ў рэспубліканскі фінал заваявала студэнтка эканамічнага факультэта Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандра Барысенка. Пераможцай у намінацыі "Гарманічная асоба" стала Крысціна Пула з Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. "За ўменне ўвайсці ў вобраз" – у гэтай намінацыі журы адзначыла Валерыю Сераду (БарДУ). Перамогу ў намінацыі "Студэнт года ONLINE", галасаванне ў якой праводзілася карыстальнікамі інтэрнэту, атрымала Надзея Ліннік (БрДУ імя А.С. Пушкіна).

*Лідзія КУРБАТ, "НТ".*